*Універсітэцкая здраўніца: справы і праблемы*

# КЛАПОЦІМСЯ АБ ЗДАРОЎІ

Санаторый-прафілакторый універсітэта праводзіць лячэбную і аздараўленчую работу сярод студэнтаў, выкладчыкаў і супрацоўнікаў. Для гэтага ў ім створана неабходная база. Тут ёсць аддзяленні света-, цепла-, электралячэння, фатарый, інгаляторый, працэдурны кабінет.

Штогод ва універсітэцкай здраўніцы папраўляюць і ўмацоўваюць здароўе каля 1060 студэнтаў, выкладчыкаў і супрацоўнікаў ГДУ. 113 чалавек, якія стаяць на дыспансерным уліку ў медпункце універсітэта, двойчы ў год праходзяць лячэнне ў санаторыі-прафілакторыі.

Усе адпачываючыя атрымліваюць высокакваліфікаваную медыцынскую дапамогу, фізіятэрапэўтычнае лячэнне, агульнаўмацоўваючую тэрапію, загартоўваючыя працэдуры, высокакаларыйнае харчаванне. Каб найвышэйшым быў эфект аздараўлення, існуе цесная сувязь у лячэнні паміж паліклінікай, медпунктам і санаторыем-прафілакторыем.

Ва універсітэцкай здраўніцы кожны год асвойваюцца новыя прагрэсіўныя метады лячэння. Гэта дазволіла знізіць працэнт часовай непрацаздольнасці сярод супрацоўнікаў, выкладчыкаў і студэнтаў ГДУ.

У мінулым годзе быў праведзены капітальны рамонт санаторыя-прафілакторыя, выдзелены дадатковыя плошчы для пашырэння лячэбнай базы. Сёлета плануецца адкрыць шэраг новых кабінетаў: лячэбнай фізкультуры, масажу, электрасну, кіслародатэрапіі. Гэта дазволіць нам аказваць лячэбную і аздараўленчую дапамогу яшчэ ў большым аб'ёме.

Ёсць у нас і пэўныя цяжкасці. Частка мэблі ў спальным корпусе прыйшла ў непрыгоднасць, не ва ўсіх пакоях ёсць туалетныя палічкі, крайне абмежавана колькасць вешалак для верхняга адзення, адсутнічаюць іншыя, на першы погляд, зусім дробязныя рэчы. Але без іх у пакоях пуста і няўтульна.

Усё гэта ўскладняе работу персанала і выклікае справядлівыя нараканні адпачываючых.

Перад адміністрацыяй ГДУ ставілася пытанне аб ліквідацыі маючых месца недахопаў. Але ёсць тут і адваротны бок справы. Самі адпачываючыя павінны беражліва адносіцца да маёмасці санаторыя-прафілакторыя, захоўваць неабходны парадак у жылых пакоях, не дапускаць парушэнняў унутранага распарадку.

Калектыў універсітэцкай здраўніцы і ў далейшым будзе прыкладаць максімум намаганняў для ўдасканальвання работы па аказанню высокаэфектыўнай медыцынскай дапамогі ўсім адпачываючым.

**С. ЗАЛАТЫХ,**
**галоўны ўрач санаторыя-прафілакторыя ГДУ.**

**ГРАФІК ЗАЕЗДАЎ — ЗМЕН У САНАТОРЫЙ-ПРАФІЛАКТОРЫЙ ГДУ НА 1985 ГОД**

| Пачатак і канец змены | Профіль змены |
|---|---|
| 27 студзеня — 19 лютага | Часта хварэючыя. Аздараўленне пасля грыпу, вострых рэспіраторных захворванняў. Захворванні органаў дыхання. Хранічныя танзіліты. Гіпертанічная хвароба, захворванні сэрца. |
| 20 лютага — 15 сакавіка | Рэўматызм — неактыўны перыяд. Захворванні лор. органаў. |
| 16 сакавіка — 8 красавіка | Хранічныя гастрыты, язвавая хвароба страўніка. Гепатыты. Анеміі. |
| 9 красавіка — 1 мая. | **Рэўматызм — неактыўны перыяд.** Вегета-сасудзістыя дыстаніі. Хранічны танзіліт. |
| 3 мая — 26 мая | Неўрыты, полінеўрыты, люмбалгія, мігрэнь, функцыянальныя расстройствы нярвовай сістэмы. |
| 27 мая — 19 чэрвеня | Гіпертанічная хвароба. Парокі сэрца. Гіпатанія. Хранічныя халецысціты. |
| 20 чэрвеня — 13 ліпеня | Хранічныя гастрыты. Язвавая хвароба страўніка і 12-перснай кішкі. Каліты. Захворванні органаў дыхання. |
| 14 ліпеня — 7 жніўня | Хранічны нефрыт. Цысціты. Мочакаменная хвароба. Алергічныя дэрмаціты. Захворванні лор. органаў. |
| 3 верасня — 26 верасня | Вегета-сасудзістая дыстанія. Функцыянальныя расстройствы нярвовай сістэмы. Захворванні лор. органаў. |
| 27 верасня — 20 кастрычніка | Захворванні органаў дыхання. Хранічныя танзіліты. Хранічны нефрыт, піеланефрыт. |
| 21 кастрычніка — 13 лістапада | Рэўматызм — неактыўны перыяд. Хранічныя танзіліты. Язвавая хвароба страўніка. Вегета-сасудзістая дыстанія. |
| 14 лістапада — 7 снежня | Хр. халецысціты. Гепатыты. Піеланефрыты. Захворванні лор. органаў. |
| 8 снежня — 31 снежня | Вегета-сасудзістыя дыстаніі. Функцыянальныя расстройствы нярвовай сістэмы. Нейрадэрміт. Захворванні лор. органаў. |

Заўвага:
1. Працуючыя інваліды Вялікай Айчыннай вайны, працы, удзельнікі вайны, часта хварэючыя, цяжарныя жанчыны, асобы, якія звязаны з прафшкоднасцямі, накіроўваюцца ва ўсе созывы.
2. Прафкомам выдаваць пуцёўкі не пазней двух тыдняў да пачатку заезда для забеспячэння абследавання накіроўваемых у санаторый-прафілакторый асоб у паліклініцы.
3. Прыбываючым у санаторый-прафілакторый мець пры сабе правільна афармленую пуцёўку, санаторна-курортную карту, пашпарт або студэнцкі білет.



Новы год — радаснае свята дзетвары. Прафком універсітэта арганізаваў навагодні ранішнік для дзяцей выкладчыкаў і супрацоўнікаў ГДУ ў Палацы культуры аб'яднання «Гомельпрамбуд». На сустрэчу з рабятамі прыйшлі героі казак, Дзед Мароз і Снягурачка.

Удзельнікі дзіцячага калектыву мастацкай самадзейнасці Палаца культуры аб'яднання выступілі са святочным канцэртам. А затым усе дзеці, узяўшыся за рукі, вадзілі вясёлы карагод вакол навагодняй ёлкі. За лепшыя карнавальныя касцюмы Дзед Мароз і Снягурачка ўручылі падарункі Дзіме Гаеву, Аліне Пячэнка і інш.

**У. БАРКОЎ,**
**старшыня культурна-масавай камісіі прафкома ГДУ.**
**Фота аўтара.**

*Спорт*

# ПОСПЕХ РАПІРЫСТАЎ

У канцы мінулага года зборная каманда Гомельскага аблсавета ДСТ «Буравеснік» па фехтаванню, якая была ўкамплектавана ў асноўным спартсменамі нашага універсітэта, прыняла ўдзел у маладзёжным першынстве студэнцкага таварыства рэспублікі. Спаборніцтвы былі асабіста-камандныя і праходзілі ў горадзе над Бугам — Брэсце.

У асабістых спаборніцтвах заліковыя ачкі давалі толькі тыя спартсмены, якія занялі месца з першага па дванаццатае. З дзевяці ўдзельнікаў каманды Гомельшчыны заліковыя ачкі прынеслі 7 фехтавальшчыкаў. Найбольш паспяхова выступілі кандыдаты ў майстры спорту СССР студэнт факультэта фізвыхавання шабліст Віталь Хімакоў, які стаў бронзавым прызёрам, і першакурснік эканамічнага факультэта Аляксандр Карачун. Сярод рапірыстаў ён быў чацвёртым.

Сенсацыйна закончыліся камандныя спаборніцтвы па фехтаванню на рапірах сярод юнакоў. Сюрпрыз прыпаднеслі будучыя эканамісты А. Карачун, І. Тарэнка і студэнт матэматычнага факультэта І. Іваніс. У барацьбе за першае месца яны сустрэліся з камандай Мінск-1. Нашы спартсмены ў напружаным паядынку здолелі перамагчы сваіх грозных сапернікаў і заваявалі першынство. Трэцімі ў камандных спаборніцтвах былі шаблісты.

У агульным заліку сярод ВНУ рэспублікі наш універсітэт заняў 2-е месца. У зборную каманду Белсавета ДСТ «Буравеснік» уключаны Віталь Хімакоў і Аляксандр Карачун. У студзені бягучага года яны прымуць удзел у першынстве ЦС ДСТ «Буравеснік», якое адбудзецца ў г. Ерэване.

**В. ЛІСОЎСКІ,**
**старшы выкладчык кафедры фізвыхавання.**



# ВЯСЁЛЫ ПЕРАПЫНАК

### ДЫЯЛОГІ Ў ЧАС СЕСІІ

— Вы ўжо трэці раз прыходзіце здаваць мне экзамен!
— Што ў тым дзіўнага? Значыць, гэта мой любімы прадмет.

### АДРОЗНЕННЕ

Студэнт пытае ў прафесара:
— Якое адрозненне паміж разуменнем часу і вечнасці?
— Калі б у мяне быў час растлумачыць гэта, спатрэбілася б цэлая вечнасць, каб вы зразумелі, — адказаў прафесар.

### НА ПОЎНЫМ ДАВЕРЫ

— Чаму ты заўсёды на экзаменах імкнешся адказваць апошнім?
— Я так давяраю экзаменатарам, што абыходжуся без сведак.

### ПАСЛЯ СЕСІІ

— Зноў уначы ты размаўляў у сне.
— Цікава: аб чым?
— Аб законах тэрмадынамікі.
— Гэта немагчыма! Я здаў тэрмадынаміку яшчэ пазаўчора.

### ДОШКА АБ'ЯЎ
### ВАМ, БЕЗБІЛЕТНІКІ

Новая форма абслугоўвання пасажыраў грамадскага транспарту ўведзена ў горадзе. Для асоб, якія не жадаюць набываць білеты, спецыяльна курсіруюць некалькі дадатковых аўтобусаў і тралейбусаў. Кошт праезду ў іх — 2 руб.

### БАРАЦЬБА ЗА ЭКАНОМІЮ

У мэтах узмацнення барацьбы за эканомію паперы ў народным тэатры ВНУ адменены тэатральныя праграмы. Прозвішчы выканаўцаў будуць пісацца зараз на спінах персанажаў, аднак, у адрозненне ад хакея, з указаннем званняў.

### ЗАГАДКІ КАХАННЯ

У групе, дзе займаецца В. Ціхі, 24 дзяўчыны. Аднак кветкі і іншыя знакі ўвагі, ён дорыць толькі старасту. «Сарцу не загадаеш», — тлумачыць гэты парадокс закаханы студэнт.

(З газеты «Беларускі універсітэт).

*Тэхнічныя сродкі—у вучэбны працэс*

# КАРЫСНЫ ДАПАМОЖНІК



Графапраектар (на здымку) дае магчымасць пры навучанні мове дынамічна падаваць вучэбны матэрыял, выкарыстоўваючы пры гэтым наступныя метадычныя прыёмы:

— паэтапная перадача вучэбнага матэрыялу на стужках для атрымання цэласнага ўзору;

— накладванне дадатковых стужак на асноўныя ўзоры.

Названыя метадычныя прыёмы могуць быць выкарыстаны пры фарміраванні граматычных паняццяў, супастаўленні асноўных правілаў і выключэнняў, дэманстрацыі граматычных сувязей або элементаў сістэмы, марфалагічным аналізе, аналізе структуры сказаў і г. д.

Графапраектар з поспехам можа выкарыстоўвацца на ўроках мовы пры кантролі ведаў, пры растлумачэнні новага матэрыялу і пры яго замацаванні.

# З НОВЫМ ЗВАННЕМ!

**Камітэт па фізічнай культуры і спорту пры Савеце Міністраў СССР прысвоіў званне «Майстар спорту СССР» вялікай групе беларускіх спартсменаў. Сярод іх — пяцікурснік геалагічнага факультэта нашага універсітэта Юрый Жукаў, які выканаў запаветны нарматыў па фехтаванню.**

Рэдактар Ул. БАЛОГА.

А322021 «Гомельский университет» — орган парткома, ректората, комитета ЛКСМБ и профкомов Гомельского государственного университета (на белорусском языке), Гомельская фабрыка «Палесдрук» Дзяржкамітэта БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. Гомель, Савецкая, 1. Аб'ём — 1 друк аркуш. Тыраж 2000 экз.
Наш адрас: вул. Савецкая, 104, п. 3-11, т. 57-16-52.

Заказ 170